ISSN 0320-7544

Беларусь

588 12 1987



Уладзімір Караткевіч на ўскрайку Белавежскай пушчы.

КАНТЭКСТ

Уладзімір КАЛЕСНІК

Хіба мажліва развітацца з вечнасцю, належачы да яе? А ён верыць, што «не знікаць паэтам вечна, у вечнай песні жывучы». Ён адчувае сябе сынам народа, прадаўжальнікам яго неўміруча-пакутлівай долі, яго мовы, якая, паміраючы і ўваскрасаючы, перажыла вякі, занепадаючы і абнаўляючыся,— жыве. Ён, свядомы сваёй несмяротнасці, хіба ад першага кроку ў паэзіі — рыхтаваўся да развітання з жыццём, сурова ацэньваў сябе, чыніў над сабой апошні суд, складаў запаветы сучаснікам і нашчадкам. Дзёрзкая трагічная паслядоўнасць, мужная гатоўнасць глянуць у вочы праўдзе і смерці, верачы ў адвечнае і несмяротнае:

Як сканаю — душа застанецца
У ззянні кожнай крынічнай
слязы,
У аеру, што з ветрам сячэцца,
У срэбных хвалях дняпроўскай
лазы.

Гэта з кнігі «Мая Іліяда», а вось з апошняга зборніка:

Падаў...
Плакаў...
Ды толькі
У той час, як не бачылі вы,
І які той цяжар не будзе,
Ён веры маёй не сагне:
Мяне пахаваюць людзі
Лепшыя за мяне.

Лепшымі яны стануць, напэўна, і таму, што прымуць да сэрца пакутлівы вопыт жыцця і слова паэта і прадоўжаць яго. Не выпадкова пераклікаюцца загалоўкамі чацвёртая, апошняя кніга паэзіі Караткевіча «Быў. Ёсць. Буду» з першым збонікам «Матчына душа». Паміж імі выйшлі «Вячэрнія ветразі» і «Мая Іліяда» — нацэленыя больш на знешні свет духоўных каштоўнасцей, на помнікі культуры, шэдэўры мастацтва, сусветныя постаці, а першая і апошняя — на свет унутраны, на вобраз ідэалу. У іх пануе прарочы дух:

Быў. Ёсць. Буду.
Таму, што заўжды,
як праклятыя,
Жыў бяздоннай трывогай,
Таму, што сэрца маё распята
За ўсе мільярды двухногіх.
. . . . . .
За ўсіх, хто крывёю піша.
У нязгодзе
З рабства подлай дарогай,
Хто за Край свой родны,
за ўсе Народы
Паўстане нават на Бога.

Прарок-бунтар. Такімі выступалі вялікія рамантыкі — Міцкевіч, Славацкі. Яны бунтаваліся супраць бога, калі той, па іх разуменню, творца гісторыі, несправядліва караў няволяй іх родны край. Бог быў для рамантыкаў разумна-нячулым традыцыяналістам, а яны сынамі прагрэсу, аднавіцелямі свету. Які ж адпаведнік рамантычнага Бога выводзіць сучасны паэт? Раздвоены. У адных творах Караткевіча бог увасабляе ідэал маральнай чысціні, гармонію быцця, як іх разумее народная этыка:

«На Беларусі бог жыве»,
Так кажа мой просты народ.
Тую праўду сцвярджае раса
ў траве
І адвечны зор карагод.

Паэт паблажліва прымае такое бяскрыўднае разуменне ідэальнасці і завяршае свой роздум пра вобраз ідэалу згодай: «І няхай да веку жыве». Але ж вядома, што ідэалы ўмеюць супраціўляцца і выкідваюць конікі, калі іх пачнуць так проста зводзіць з паднябесных арбіт на зямныя калдобіны. Ідэалам Людвіка Заменгофа было, напрыклад, стварыць мову, якая б прымірыла звадкі і калатню паміж палякамі, беларусамі і яўрэямі, што насялялі яго родны даваенны Беласток. Ён вынайшаў эсперанта. Нацыянальных антаганізмаў гэтая ідэальна «справядлівая», складзеная паліглотам з розных моў свету, супермова не суняла. Не стала яна мовай прымірэння чалавецтва, але праз гады аказалася вельмі здатнаю для праграмістаў і можа стаць сусветнаю мовай кібернетыкі. Так і ідэалы красы і цнатлівасці не гатовенькімі і цэленькімі ўпалі з неба, яны адкрываліся людзьмі па крошачках, здабываліся ў жыццёвай барацьбе супраць антыідэалаў — брыдоты, подласці, здрады. За іх змагаліся пакаленні. І завяшчалі змагацца нашчадкам. Таму і паэт ставіцца да праблемы актыўна: ён лічыць, што ісціна, справядлівасць могуць быць здабыты толькі ў змаганні: у смелым дыялогу, адкрытай і сумленнай канфрантацыі думак, пазіцый. Караткевіч бярэ на сябе цяжар няўдзячнай, таму двойчы пачэснай місіі ерэтыка, прыроджанага спрэчніка, парушальніка спакою, ён падвяргае сумніву і крытыцы ісціны агульнапрызнаныя, вечныя, дзёрзка заклікае абнаўляць рангі каштоўнасцей і святасцей, каб не заскаруз у застоі дух чалавечы: «Ерась, вялікая маці ўсіх народаў вялікіх, выратуй сына свайго, што не будзе быдлець спакваля». Абгрунтоўваючы думку пра мужную і цяжкую патрэбу духу ісці наперакор усяму, напярэсціг усталяванаму, насустрач невядомаму, Караткевіч стварае адзін з сучаснейшых праграмных вершаў кнігі:

Не злабіся на ерэтыкоў,
Не цягні ў самое неба выю.
Свет без іх — чародка прасцякоў,
Свет жывы — пакуль яны жывыя.
Ты мудрэц — пакуль мудраць яны.
Ёсць яны — няма ў табе падману.
Не гані агнём іх, не кляні,
А малі аб іх ураваннi.

Натуральна, што пад агонь ерэтычнай крытыкі трапляе і бог, ён аказваецца не такім бездакорным, як лічыць наіўна-апалагетычнае ўяўленне: «Бог і сам не ведае нічога, Бог і сам на ростані дарог». Гэта аднак не зніжэнне вобраза ідэалу, а толькі вынікі і выдаткі звядзення ідэалу на зямлю. Калі бог сыходзіць да людзей і падае ім ідэал, як закон, дэкрэт ці наказ, дык са зместу ідэалу выветрываецца дух ідэальнасці, а талковаю праграмаю дзеяння ён не становіцца. Вось і трапляе ў тупік бог-дырэктыўшчык, разводзіць рукамі на ростанях зямных выбоістых дарог. Ідэал тады ідэал, калі ён вабіць, узносіць, застаючыся дасягальным і недасягнутым.

Памятайма, што спрэчкі, адмаўленне, бунтарства моцныя не самою апантанасцю, а перад усім зместам таго, у імя чаго паднімаецца безаглядная крытыка. Сцвярджальнае ядро ерэтычнага бунту Караткевіча высокае і яснае — гэта працяг узбагачэння патрыятычнай і гуманістычнай легенды беларусаў. Часта галоўная думка праграмных твораў вырастае з аўтарскага асэнсоўвання запаветаў, пакінутых папярэднікамі. У «Маёй Іліядзе» вешчуном выступаў М. Багдановіч, прадоўжаны У. Караткевічам:

Ты сказаў нам:
«Унукі Скарыны,
Дзе ваш гонар, моц і краса!
Ёсць і ў вас, як і ў іншых,
святыня.
Не давайце святыні псам!
Не давайце з яе глуміцца,
Бо праспіць яна ясну зару,
Бо святы ізумруд заімгліцца
У пярсцёнку тваім, Беларусь».

Слоў, узятых у двукоссе, няма ў Багдановіча, яны — сінтэз і бліскучы працяг думак з яго патрыятычных вершаў «Безнадзейнасць», «Беларусь, твой народ дачакаецца...», «Пагоня» і інш. У апошнім зборніку вешчунамі і апосталамі ідэалу выступаюць іншыя героі і духоўныя важакі нацыянальнага адраджэння — Кастусь Каліноўскі, Ігнат Буйніцкі, Ігнась Грынявіцкі — яны першапраходцы, сцяганосцы свабоды і чалавечай годнасці:

Слава Першых, якія сабой
заплацілі
За айчыну і слова, племя і род,
І душу аддалі, каб яна ажывіла
Мёртвы гліны камяк:
Свой родны народ.

Да шэкспіраўскіх трагедыйных вышынь паднімаецца Караткевіч у вершы «Прарок», задуманым як маналог з 3-га акта трагедыі «Кастусь Каліноўскі»:

Пакутаваць цяжка гневам
і журбою,
У пустыні марна
да пяскоў гукаць
За край, даўно
адвучаны ад бою,
Ад мовы, гонару і языка.

НЕСМЯРОТНАСЦІ

Але, наперакор абставінам, трэба застацца адзінокім ахвярнікам без падтрымкі і падмогі, так загадвае годнасць патрыёта і гонар, што не згас яшчэ, хоць бы ў адным уласным сэрцы. А з годнасцю дружыць і надзея, і вера ў збавенную сілу ўласнай смерці, якая абудзіць годнасць у народзе:

Пачуць, хаця і ў першы
дзень па сконе,
У згасанні мозгу ярасны
ваш крык.
І зразумець, што вы ўзламалі
краты,
Апошняй думкай, цяжкай,
як свінец,
Што блізкі ён, вялікі
ваш пачатак,
Што блізкі ён, вялікі мой канец.

Славутай карцінай «Вясна» Фердынанда Рушчыца, апошняга магіканіна неарамантызму віленскай мастацкай школы, навеяны вобраз верша «Ворыва на валах», дзе мірная праца асацыіруецца з відовішчам гістарычнага валюнтарызму, пераворваннем межаў гістарычна здзірванелага краю:

Я гэта бачыў сам,
хоць адышло:
У апошні можа раз
на белым свеце
Ішлі быкі і ворыва плыло,
А зверху — хмары, чырвань,
сінь і вецер...
. . . . . .
Быкі ў крыві, а капыты ў гразі.
І ўсё здаецца мне:
нарогам-зброяй
Быкі, як старажытныя князі,
Маю радзіму на кавалкі крояць.

А лічацца ж толькі тыя ідэалы, што ўкараняюцца на зямлі, хто б яе ні араў, чым ні засяваў.

Караткевіч — рамантык ва ўсім, нават у катэгарычным адмаўленні рамантычнай прыроды свайго таленту. На спробу падвесці яго пад рамантычны эталон, ён бурна пратэставаў: «Не рамантык я! Я — рэаліст! Я **так** бачу жыццё і пішу толькі праўду». Не жадаў слухаць заўваг, што дэвізам рамантыкаў была жывая праўда, гэта значыць сагрэтая сэрцам, ачалавечаная любоўю да простага люду, здольная працівіцца халоднай мёртвай разважнай праўдзе, якую прапаведавалі арыстакраты, халодныя класіцысты. Караткевіч добра ведаў гісторыю рамантызму, але быў пэўны, што гісторыя не паўтараецца, і баяўся стаць антыкварнай фігурай у паэзіі. Ён прагнуў быць паэтам сучасным, змагарскім, нават у сваіх гістарычных творах. Яго воляю і марай было ўзброіць сучасніка духоўнасцю, далучыць да гісторыі радзімы, а цераз яе — да сусвету, да чалавецтва. Паэт забіраўся ў сховы скарбаў старой Беларусі, знаходзіў крамянёвыя наканечнікі стрэл, каменныя тапары і малаткі, ачышчаў ад іржы лёзы мячоў, аздабляў кабінет фігурамі анёлаў, выратаваных з апусцелых касцёлаў і збуцвелых капліц. А потым складаў творы пра неўміручасць скарбаў народнага духу, таго, што Скарына называў «усякаю добраю навукай» або мудрасцю божай і чалавечай.

Скрайне асабістым, ажно тэндэнцыйным было яго ўспрыманне тэрміну рамантызм. Склалася яно, калі рамантызм стаў казлом адпушчэння за хібы рэалізму. Яго лічылі нейкім псотным ідэалістам, мройным падманшчыкам, прадаўцом салодкіх наркозаў, занятым толькі тым, каб змыліць і адвесці чытача ад праўды рэальнага жыцця. Бяда ж была ў тым, што праўда ў працах прапаведнікаў выключнасці рэалізму была не іхняй і не жыццёвай, а ўзятай часта з вуснаў вульгарных сацыялагізатараў, якія мелі гатовыя рэцэпты нават на прапорцыю станоўчага і адмоўнага ў вобразе. Караткевіч хацеў быць змагаром за лепшую рэальнасць, але не безадказным стваральнікам паэтычных міражоў. Адмяжоўваючыся ад абрыджанага дагматычнага рамантызму, паэт у душы і ў слове заставаўся ваяўнічым рамантыкам. Не прызнаваўся сабе, што ідэалізуе, але... яго натхняла вера ў ідэал.

— Ну і што ж?—скажам мы сёння.—Спракавеку ідэалізуе народнае мастацтва, паказваючы рэальнасць як дыстанцыю паміж тым, што існуе, і тым, што быць павінна. Чарадзейная казка і рытуальная песня часта пакідаюць рэальнае ў падтэксце, а належнае адлюстроўваюць як існае. Прыказка ці анекдот жывуць амаль без ілюзій, стараюцца быць насмешліва цвярозымі, практычнымі, але і там належнае на першым месцы. Многія познія жанры фальклору, напрыклад, балады, неабрадавыя песні паралельна даюць два вобразныя рады, супрацьпастаўляючы мару яве і цераз параўнанне абагульняюць, тыпізуюць, выяўляюць сутнасць. Паказ належнага, увядзенне ідэалу само па сабе не з'яўляюцца ідэалізацыяй, прыхарошваннем. Толькі выдаваць належнае за існуючае, ужо здзейсненае ёсць падман і містыфікацыя, парушэнне гнасеалагічнай дысцыпліны, культуры пазнання, аднолькава абавязковай для рэалістаў і рамантыкаў. Гэтым грашыла ў нас ілюстрацыйнае мастацтва, што выдавала жаданыя ідэі за здзейсненыя факты, ашуквала і размагнічвала чытачоў, пакуль не надакучыла. Ідэал, хоць і з'яўляецца данасцю духоўнай, але ён такая ж рэальнасць, як і з'явы матэрыяльнага свету. Мастак можа праўдзіва адлюстраваць свет рэчаў і свет ідэй, свет вытворчых адносін і свет адносін асобы да сэнсу быцця, свет бачымы і свет жаданы. Звычайна не паасобку адлюстроўваюцца гэтыя два станы свету, а ва ўзаемасувязі і ўзаемадзеянні, а сродкі выбіраюцца як жыццёвыя так і ўмоўныя. Гэта мы, прастаказватыя крытыкі і нашкеленыя намі чытачы, часта бачым у паралелях рэальнага і належнага падазроную «блытаніну», грэх супраць праўдзівасці, якую нам хочацца ўяўляць, сумаю з'яў ці падзей у цяперашнім часе і ў адным месцы на зямлі. Часы мінулы і будучы пры такім разуменні ўсяго і служаць для падвышэння сучаснасці, а не дапамагаюць фарміраваць яе. На справе ж мінулае і будучае фарміруюць і саму нашу сучаснасць і нашу здольнасць бачыць, ацэньваць яе як рэальнасць жывую, сацыяльную, дзе мерай рэчаў — чалавек, яго шчасце, яго лёс:

Больш ні ў чым на зямлі
мне няма патрэбы:
Толькі б шчасця болей яе сынам,
Больш любові, пяшчоты,
сумленнага хлеба,
Менш хлусні, менш свінцу,
менш агню палям.
Толькі б хлопцы былі да дзяўчат,
як ветрык,
А дзяўчаты да хлопцаў,
як сонца былі.
Толькі б мукі зямлі
ў зямныя нетры
Разам з целам маім навек
адышлі.

Каханне і любоў пераплятаюцца і, нібы ў казцы, ператвараюцца з жыццёвых адносін у паняцці філасофскія, экзістэнцыяльныя. Яны спасцігаюць агульны стан і унікальную сутнасць быцця ў самых розных праявах, ад мілавання хлопца з дзяўчынай да спалучэння неба, зямлі і вады, з чаго паўстае прырода:

Плод кахання бору і хмары,—
Мой Дняпро, і Бяроза, і Нёман.

Таксама ў сферы інтымнай дзеюцца рэчы быційна-глабальныя, калі каханнем ахоплены душы глыбокія, свядомыя сваёй творчай моцы і прызвання:

Ты дала мне імгненне і шчасце,
Я табе даў за гэта — бяссмерце.

Менавіта філасофскі погляд на каханне-любоў напоўніў узрушлівай сілай «Паэму пра явар і каліну», «Грубае і ласкавае» і многія лірычныя вершы. У аснову першага твора лёг традыцыйны баладны сюжэт (свякроў атручвае нялюбую нявестку, закаханыя злучаюцца пасля смерці), але талентам мастака звычны матыў падняўся да ўзроўню вялікага мастацтва: абгрунтаваныя псіхалагічна і канкрэтызаваныя гістарычна вобразы набраліся эпічнай велічы і чалавечай глыбіні, сталі дзейнічаць не толькі ў сямейна-псіхалагічнай калізіі, але перамясціліся на ўзровень нацыянальна-гераічны. Вось дыялог воіна Яна з гарадзенскім князем Давідам:

Яне! Прасі, чаго хочаш!
Ты ў ворага славу адняў,
Ты прабіўся праз строй варожы,
Ты магістра звалiў з каня.
Ты —
зламіў таму быдлу шыю,
Ты прасі хоць свет у мяне...
— Княжа... Мне паланянку...
Марыю...
Яна пакахала мяне.
— Хочаш золата, колькі важыш!
Ці бурштынаў,
каб аж скамянець!
— Княжа... Мне паланянку...
Марыю...
— Хлопча!!! Аб'еўся блёкату!!!
Немец з прусам кроў нашу п'е...
Яна пруска. Балтка. Рабыня!
— Княжа, я кахаю яе.

Парадоксы кахання ў другой паэме маюць агульналюдскі сэнс: каханне і рэўнасць, любоў і нянавісць, ласка і грубасць, вернасць і здрада, гуртаванне і раз'яднанасць людзей — разглядаюцца як універсальныя катэгорыі, што вызначаюць якасць быцця, сэнс і патрэбу існавання індывідаў у свеце. І натуральна, постаць каханай можа ператварыцца ў радзіму, нават у маці-зямлю, або ў ідэю свету. Праўда, Караткевіч не прымае метафізічных канцэпцый пра сусветную збавіцельна-даравальную любоў, ягоная любоў дзейная, нават ваяўнічая, дзеля яе панавання герой змагаецца, а перамогай гатовы лічыць сваю смерць на полі бою і слова любоў піша на баявых сцягах радзімы:

...І над строем тваіх
абаронцаў суровых,
Над клінкамі, што п'юць
гарачую кроў,
Будзеш ты лунаць
На харугвах пунсовых.
Залатое святло!
Прамаці любоў!

Змест паняцця любоў разрастаецца ў Караткевіча на ўсіх мажлівых каардынатах. Калі ў «Маленні аб чашы» (зб. «Мая Іліяда») ён, застаючыся ў межах практычнай канвенцыі быцця, пісаў:

Беларусь мая, ты адзіная,
Перад кім на каленях стаю:
Мне, слузе твайму,
цяжка загінуць,
Лёгка — жыць у славу тваю,—

дык у паэме «Грубае і ласкавае», а таксама ў шэрагу вершаў апошняй кніжкі паняцці **лёгка** і **цяжка** мяняюцца месцамі, выводзячы імкненне да ідэалу за межы этыкі, практычных разлікаў:

Ты не плач. Я скажу табе
ціха-ціха,
Што цалую лязо чужога мяча.
Ён дабро мне зрабіў,
пракалоўшы грудзі:
Я ўпэўнены ў гэты
шчаслівы дзень,
Што цябе ні бог,
ні д'ябал,
ні людзі
Больш не змогуць вырваць
з маіх грудзей.

Тут не містыка і не пухіры экзальтаванасці, а празорлівасць сталага этычнага бачання: цяжэй жыць, чым памерці аднаму за дваіх. Не цямілі такога прыдумшчыкі формулы «и за того парня», пра што сведчыць і нядоўгі век выслоўя.

Караткевіч жыве ў паэзіі са сваёю адметнаю праграмай, гэта праграма рамантычнай духоўнасці. Лірычны герой не пагаджаецца на прыземлены практыцызм і дзяляцкі спрыт.

Супраць бросні на паверхні жыццёвай плыні змагаецца рамантык, жадаючы вярнуць людзям усю паўнату іх чалавечай сутнасці, вянок чалавечнасці — высокую духоўнасць, павагу да мінулага і веру ў будучыню. У чым жа бачыць паэт хібы духоўнага свету сучаснікаў, як уяўляе сабе ўзбагачэнне? Перад усім у асабістай годнасці. А годнасць асабістая складаецца з годнасці класавай, нацыянальнай і агульначалавечай. Пахібкамі ў гэтай сферы паэт тлума-

чыць адставанне грамадзянскай культуры, нястачу таго гістарызму мыслення, што здольны ператвараць веды аб мінулым радзімы ў любоў да яе, у патрабавальнасць да сябе і павагу да іншых народаў. Той, хто не паважае сябе, не здольны паважаць іншых, ён можа толькі прытварацца, паддобрывацца.

Не слушна будзе без агаворак успрымаць вядучы матыў кнігі «Быў. Ёсць. Буду» як пафас агульначалавечага. Чалавечнасці — так, але не агульначалавечага, паколькі паэт, гістарычна адукаваны інтэлігент, ведае, што не ўсім «чалавекам» і народам аднолькава страшны былі нават паморкі і эпідэміі, а тым больш варожыя нашэсці, пагрозы нацыянальнай свабодзе, праву на гістарычнае быццё. Ён і ў мінулым, і ў сённяшнім свеце бачыў прыклады, што ад голаду і хвароб паміраюць у першую чаргу бедныя, ахвярамі захопнікаў становяцца слабыя, а багатыя ды хвацкія, а тым больш дужыя ды хіжыя выжываюць і, жывучы за кошт пакорных, выдаюць сваё панаванне за ласку і дабрадзейства для прыгнечаных, велічаюць свой разбой цывілізацыйнай місіяй. Найбольш мучылі яго праявы атавістычнай залганасці ў свеце. Караткевіч па-рыцарску змагаўся супраць аблуды. Ён прадчуваў, што вялікае зло, якое прынёс культ асобы нашай многанацыянальнай радзіме і камуністычнаму руху ў свеце, быў вынікам не толькі асабістых заган Сталіна, а перад усім нізкай грамадзянскай і канкрэтна-палітычнай культуры ў краіне. У гістарычных творах пісьменнік выкрываў нашу фатальную спадчыну, развенчваў дзвюх загубіцельніц колішніх нашых традыцый грамадскага сужыцця — шляхецкую самаволю, што ператварылася ў анархію на бяду Рэчы Паспалітай, і царскі дэспатызм імперыі Раманавых, што спараджаў чарнасоценны шавінізм у пануючай нацыі і фанатычныя нацыяналізмы прыгнечаных.

Так, многія з тых крыўд, якія краналі незраўнаную ўражлівасць душы паэта, былі свядомым ці несвядомым абрыджваннем яго апанентамі агульначалавечай этыкі і маралі, якім прышываўся звычайна ярлык абстрактнага гуманізму. Гордага паэта наперакор цягнула да агульначалавечага, але гуманізм беларускага адраджэння, з крыніц якога ён чэрпаў ідэі, не быў абстрактным, бо вырас у сістэме нацыянальна-вызваленчай і сацыяльна-дэмакратычнай этыкі, якую стварыў вызваленчы рух, абапіраючыся на рэвалюцыйны вопыт суседніх народаў: рускага, украінскага, польскага. Пра гэта сведчаць ідэйныя запаветы Каліноўскага, Багушэвіча, Багдановіча і Купалы. Чалавечнасць была ў той сістэме звышідэяй, але не толькі і не абавязкова чымсьці агульналюдскім, паколькі шырмай агульналюдскага прыгнятальнікі прыкрывалі свае класавыя і вялікадзяржаўныя пакусы і амбіцыі. Самыя светлыя дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння бачылі агульначалавечы ідэал у роўнасці ўсяго працоўнага люду планеты, у роўнай годнасці і павазе ўсіх нацый, усіх народаў. Такі кантэкст агульначалавечага прымае Караткевіч. Ад справядлівасці ў сваёй краіне да справядлівасці ў свеце — вось дыяпазон і напрамак стрэлкі на шкале ідэалу.

Такое разуменне палемізавала з завядзёнкай на лёгкую, зручную і прыемную духоўнасць, калі культурнікі і масавікі, нават школьныя педагогі прывучалі думаць, што духоўнасць, як мода, даецца лёгка, нібы лёгкая музыка, простая паэзія ці цалкам зразумелая без слоўнікаў мова вучонага трактата. Караткевіч папярэджвае перад прафанацыяй духоўнасці, падкасцю на тлумлівую бяздумнасць у мастацтве і культуры, але не спяшаецца асуджаць, працягвае руку тым, хто шчыра аступаецца, міжвольна, як гэтая вось «жанчына з дзіцячай спуджанай душой»:

У адвечнай празе чалавека
Яе душа, яе рука
Шукае месца ў гэтым веку
І ўсё не можа адшукаць.
То ў шыльдах Суціна, то ў Хласка,
То ў Бацічэлі, то ў Манэ,
У канкрэтнай музыцы Пікаса,
У хлусні, каханні і віне.
У канкрэтным мужы і ў кватэры,
У калекцыі старых карцін,
Ва ўсмешлівых старых хімерах...
Ці новых! — Знае бог адзін.

Напэўна сучасным шукальнікам «лёгкай» духоўнасці нешта ў кнізе Караткевіча здасца цяжкаватым, не зусім зразумелым. Але ж таму і называецца цяжар духоўнага росту пачэсным, што прыходзіць з уменнем ператвараць незразумелае ў зразумелае, цяжкое ў лёгкае.

Супрацьпастаўленне маральных вышынь і нізі, належнага і наяўнага, паднебнага і карытнага — чырвоная нітка лірычных маналогаў У. Караткевіча. Дзеля кампраметацыі нізкага ён не баіцца гаварыць грубыя словы, уводзіць жывёльнае, каб высвечваліся на цёмным фоне самацветы высокага духу:

Гіене — баяцца, сабаку —
вішчаць,
Свінні — рыцца ў гноі сваім.
А льву патрэбны калючы гушчар,
Родны край і свабода ў ім.

Рамантычная ў Караткевіча раз'яднанасць і канфліктная спалучанасць зямнога і занябеснага. Духоўным арыенцірам і каштоўнасцям належыць скрозь пяршынства, нават смерць сапраўдная і канчатковая для чалавека — гэта смерць духу, забыццё свайго роду, сваіх духоўных карэнняў, нават пры жыцці:

І на іншых вяршынях суровых
(Вера! Роўнасць!
Свабода! Край!)
Ты струменьчык матчынай мовы,
Быццам маці, не забывай.
Ты забыў! Ну што ж,
на дасвецці
Ты без сонца будзеш канаць...

Гэта здорава, што сёння літаратурная грамадскасць Беларусі строга ацэньвае праявы абнаўлення на паэтычнай ніве, залічваючы ў актыў бадай усяго творы П. Панчанкі ды яшчэ У. Някляева, хоць трэба памятаць, што беспадстаўная прыдзірлівасць, як і безгустоўная ўсёеднасць — аднолькава збівае з тропу, прывучае да безадказнасці. Хтосьці з моднікаў перабудовы нават зларадніча ў друку наконт таго, што вось у шуфлядах сталоў нядаўна памерлых класікаў члены камісіі па спадчыне не знаходзяць рукапісаў з тайнымі духоўнымі татаментамі, усё ў свой час было надрукавана без перашкод. Перабудоўвацца, выходзіць, трэба моладзі самой, без добрых прыкладаў і парад. Пакінем на рахунку легкадумства падобныя «адкрыцці» і воклічы. Зазначым аднак, што з мудрай сентэнцыяй Андэрсенавага дзіцяці пра голага караля яны нічога агульнага не маюць, падобны хутчэй да рэплікі казачнага Івана-прастака: «Цягаць вам, не перацягаць». Беларуская літаратура, як і ўся савецкая літаратура, мае свой сур'ёзны рахунак як да перыядаў панурай пільнасці, сляпой жорсткасці, так і да перыядаў казённа-бюракратычнай абыякавасці і лянівай дабрадушнасці.

Пасмяротны зборнік У. Караткевіча якраз з'яўляецца адным з самых значных укладаў, запісаных на рахунак перабудовы, гэтая кніга — прадвеснік новага мыслення — грамадзянскага і паэтычнага. Увайшлі сюды творы, якія аўтар пісаў раней, пісаў без аглядкі на выдавецкую «праходнасць», амаль не публікаваў у перыёдыцы, працаваў часам і без веры, што яны так скора ўбачаць свет. Паўстае са зборніка бунтарны дух ворага ўсякай артадоксіі, усякай руціны, высока гучыць голас праціўніка забарон і ўказальных знакаў на шляху творчага духу. Караткевіч — прынцыповы змагар супраць стандартызацыі духоўнага жыцця, у якой ён прадчувае пагрозу і замах на чалавека, яго індывідуальнасць, непаўторнасць, святасць асобы, здольнай тварыць. Ажывае са старонак спантанна шчыры, любячы і гняўлівы, узвышаны і расчулены, пахмурны і насмешлівы Валодзя Караткевіч. Душа яго звініць крышталёвай чысцінёй прызнання ў вернасці беларускай адроджанай традыцыі Каліноўскага, Купалы, Багдановіча, Танка, раскрывае абдымкі ўсім паэтам, хто яднаў у адным вобразе каханую дзяўчыну, родную маці і радзіму, а нават сусвет. Паэт верыць: «Тых, хто носіць небасхіл у сэрцы, нельга ні ўджаліць, ні забіць». А да няздольных паднімацца к зорам ён ставіцца са здзеклівай карэктнасцю: «Давай на брудэршафт з табою дзёрнем: хачу ад сёння быць з табой на «вы».

Апошняя кніга паэта дае магчывасць засведчыць здзіўляючую цэльнасць і паслядоўнасць бунтарнага, часта ўшчуванага жыццём, але не выбітага з мажору мастака. Ён мужна і з годнасцю прайшоў праз вернасць сабе і радзіме, захаваў годнасць сваёй беларускай, далучанай да ўсіх скарбаў свету, душы. «Быў. Ёсць. Буду» — загаловак падказаны пачуццём асабістай, нацыянальнай і чалавечай годнасці і адказнасці.

Шкада, што так хораша, так любоўна выдадзенай сябрамі кнігі, сярод якіх мы бачым не толькі брата па пяру і сэрцы, рэдактара зборніка і аўтара натхнёнай прадмовы да яго, Рыгора Барадуліна, але і мастака П. Драчова, фатографа В. Ждановіча і выдавецкіх работнікаў на чале з М. Дубянецкім, — не патрымаў у руцэ сам незраўнаны знаўца прыгожага і людскага — Уладзімір Караткевіч. Нехай уцешыць чытача яго вера ў несмяротнасць дабра і хараства. Кніга яго — вымпел, узняты насустрач абнаўленню, яна гаворыць многа мудрага пра нормы і дэфармацыі ў сферы каштоўнасцей, шчыра падказвае здаровыя суадносіны нацыянальнага і сацыялістычнага ў ідэале савецкага патрыятызму і агульналюдскага братэрства.

Фота аўтара.

НАШ КАЛЯНДАР-88

Нашы пастаянныя падпісчыкі неаднойчы пісалі нам, што, атрымаўшы часопіс, яны найперш з нецярплівасцю адкрываюць яго якраз пасярэдзіне, на каляровай укладцы, дзе змешчаны каляндар на наступны месяц. І сапраўды, таму, хто выразае каляндар, каб павесіць над сваім пісьмовым сталом, зусім не ўсё роўна, на што будзе скіраваны яго позірк некалькі тыдняў.

Таму зразумела наша жаданне пазбавіць каляндар выпадковасці, надаць яму тэматычны характар. Так, пазалетась вы пазнаёміліся з помнікамі старажытнага беларускага дойлідства, летась з пяшчотай і замілаваннем узіраліся ў знаёмыя краявіды, пашырылі свае веды пра помнікі прыроды Беларусі. Сёлета мы прадоўжым знаёмства з гісторыяй і культурай роднага краю. Настаў час бліжэй пазнаёміцца з помнікамі мастацтва — творамі жывапісу, якія захоўваюцца ў скарбніцах Дзяржаўнага мастацкага музея БССР.

Сустрэча з цудоўным — заўсёды свята. І разам з тым гэта тая лакмусавая паперка, якая дазваляе пранікнуць у таямніцу душы кожнага чалавека. Паназірайце як-небудзь за наведвальнікамі выстаўкі. Адзін пралятае сокалам па залах экспазіцыі з выглядам чалавека дзелавога і надзвычай занятага, якому цудам удалося адарвацца на гадзіну ад службовага крэсла. Навошта яму патрэбна аглядаць выстаўку! Ды каб потым, у размове з патрэбным чалавекам, паказваючы сваю кампетэнтнасць, глыбакадумна зазначыць: вось гэты партрэт мастаку ўдаўся, а гэты пейзаж крыху не дацягнуў — тут трэба было пакласці больш цёмныя фарбы, а тут — больш светлыя. Другі затрымліваецца перад палатном роўна настолькі, каб зразумець, што там «намалявана», з аднолькавай інтанацыяй ускліквае: «Якая харошанькая дзяўчынка!» і «Якая міленькая авечка!» і пакідае выстаўку з гэткім жа выразам нудоты на твары, з якім і прыйшоў. Трэці амаль абыякавым позіркам акідвае адно палатно, другое, пятае і раптам застывае, ашаломлены, перад якім-небудзь букетам сціплых палявых кветак. І ўжо не адыходзіць ад карціны, разглядае яе то зблізку, то здалёку, і здаецца, што ён удыхае водар гэтых самых палявых красак, дыхае паветрам свайго басаногага маленства...

Вядома, не ўсе карціны здольны вось так адразу захапіць у палон, закрануць нешта дарагое і блізкае сэрцу. Іншым разам спатрэбіцца немалы час, каб мы змаглі прыняць палатно, зразумець перакладзеныя на мову фарбаў пачуцці і думкі аўтара. Часцей за ўсё дапамагае тут няпісанае правіла: каб адчуць харство і глыбіню твора, зразумець кожны штрых, кожную метафару на ім, трэба найперш пачуць музыку, якая гучала ў душы яго творцы, даведацца пра пакуты і радасці, якія спадарожнічалі мастаку на шляху да стварэння карціны.

Спадзяёмся, наш каляндар у некаторай ступені дапаможа вам у гэтым.

У калекцыі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР налічваецца каля трыццаці работ выдатнага рускага мастака канца XIX — пачатку XX стагоддзя Барыса Міхайлавіча Кустодзіева. Дыяпазон яго творчых накіраванняў быў даволі шырокі. Цудоўны графік, тэатральны дэкаратар і скульптар, ён больш за ўсё праславіўся сваім жывапісам — жанравымі, гістарычнымі і партрэтнымі творамі.

Адна з лепшых работ мастака савецкага перыяду — партрэт Кустодзіева К. Б. Дзевятнаццацігадовага юнака з тонкім, адухоўленым тварам, сына майстра, мы бачым у прыгожым усходнім халаце з кнігай у руках. Побач на століку — стосік выпускаў «Гісторыі мастацтваў» А. Бенуа, папулярнай у тыя гады. Як гэта часта бывае, аксесуары падкрэсліваюць тэму партрэта — адзінства чалавека і свету, у якім ён жыве (пазней Кірыл Барысавіч стаў вядомым тэатральным мастаком). Бліскучае прафесійнае майстэрства, уменне перадаць індывідуальныя ўласцівасці чалавека, дэкаратыўнасць і іншыя асаблівасці жывапісу Кустодзіева ўласцівы гэтаму цудоўнаму ўзору яго творчасці.